Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. АЎТОРАК № 205 (27320) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Шматлікія каштоўныя рэчы, якія трапляюць да калекцыянера Андрэя Фішбайна, ён прадае Лідскаму гісторыка-мастацкаму музею за зусім сімвалічныя грошы. Прычым з умовай, каб гэтыя прадметы не пакідалі межы рэгіёна, бо яны — частка нашай культуры. Самае галоўнае, на думку калекцыянера, не проста сабраць цікавую калекцыю, а дакрануцца да нейкай часткі мінулага.**

СТАР 4

*ЛІЧБА ДНЯ*

## *32 тоны*

***складае залаты запас Нацыянальнага банка Беларусі на 1 кастрычніка. Толькі за трэці квартал гэтага года ён вырас на 300 кг. Такая інфармацыя размешчана на афіцыйным сайце Нацбанка, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА. На 1 студзеня 2012 года залаты запас Нацыянальнага банка складаў 31,7 т. У першым квартале ён вырас на 200 кг і дасягнуў 31,9 т на 1 красавіка 2012 года, у другім квартале знізіўся -- таксама на 200 кг да першапачатковых 31,7 т. Залаты запас Нацыянальнага банка Беларусі вылічаецца ў тонах і ўключае золата (пераважная доля), а таксама серабро, плаціну і паладый.***

## ІСТОТНА ПАХАЛАДАЕ І МОКРЫ СНЕГ

**У аўторак тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў малярухомых атмасферных франтоў, што рухаюцца да нас з боку паўночнага захаду Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Месцамі чакаюцца невялікія ападкі. Тэмпература паветра — плюс 6—11. Атмасферны ціск пачне павялічвацца ў сераду. Таму ўначы па ўсходзе, а ўдзень у асобных раёнах чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман і слабы галалёд. Да нас завітае холад са Скандынавіі. Уначы чакаецца ад мінус 3 па поўначы, да плюс 5 па паўднёвым усходзе, удзень — 3—10 градусаў цяпла.

У чацвер атлантычны цыклон з боку Балтыйскага мора прынясе ў Беларусь ападкі. Дажджы будуць на ўсёй тэрыторыі краіны, а ў Віцебскай вобласці магчымы нават першы мокры снег. Раніцай месцамі туман і галалёд. Уначы будзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень — 3—10 цяпла.

Напрыканцы тыдня на ўсёй тэрыторыі Беларусі пачне гаспадарыць арктычнае паветра і стане яшчэ халадней.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.10.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8500,00 | ▼ |
| Еўра | 11080,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 275,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1041,54 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# 1027-я ЗАСЛАЎСКАЯ ВОСЕНЬ



**Навучэнцы Мінскага мастацкага вучылішча імя Глебава на эцюдных замалёўках у Заслаўі, якому сёлета спаўняецца 1027 гадоў.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДКРЭСЛІВАЕ НЕАБХОДНАСЦЬ ЦВЁРДАГА ПРЫТРЫМЛІВАННЯ ВЫЗНАЧАНАГА НА ВАЛЮТНЫМ РЫНКУ КУРСУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 кастрычніка прыняў з дакладам старшыню Праўлення Нацыянальнага банка Надзею Ермакову. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Зусім нядаўна мы канстатавалі факт, што нам удалося ў нейкай ступені пераламаць хоць невялікія, але негатыўныя тэндэнцыі на валютным рынку, звязаныя перш за ўсё з чуткамі і палітыкай, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Хацеў бы, каб вы ў дынаміцы расказалі пра тое, што адбываецца на валютным рынку на сённяшні дзень, ці развіваецца гэтая тэндэнцыя на паляпшэнне». «Мы павінны свята прытрымлівацца таго курсу, які мы вызначылі і абвясцілі народу. Людзі павінны абсалютна разумець нас і верыць. Калі Нацыянальны банк абвяшчае такую палітыку, то яе трэба і прытрымлівацца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама пацікавіўся ацэнкамі Надзеі Ермаковай работы беларускай эканомікі ў цэлым, асабліва ў пытанні экспартных паставак: «Як у нас развіваецца сітуацыя, што з запазычанасцю перад нашымі прадпрыемствамі? Таму што былі факты, калі выручка нясвоечасова вярталася ў краіну».

Як паведаміла кіраўнік Нацбанка, запланаваныя на 2012 год паказчыкі выконваюцца: «Інфляцыя знаходзіцца ў рамках запланаванай. За перыяд са студзеня па 16 кастрычніка індэкс цэн склаў 117,1%. Сярэднямесячны прырост — 1,7%. Пры гэтым базавая інфляцыя склала толькі 14,1%. А рост адміністрацыйна рэгуляваных цэн і цэн на агароднінную прадукцыю, якія звязаны з сезоннасцю, склаў 21,6%». «Гэта значыць, манетарныя і рынкавыя метадамі інфляцыя ўтрымліваецца. Гэта тая палітыка, якая была вызначана», — адзначыла Надзея Ермакова.

«На валютным рынку, улічваючы падатковыя дні і тое, што Нацыянальны банк манетарнымі метадамі сціснуў грашовую масу, рэсурсную базу банкаўскай сістэмы, сітуацыя таксама палепшылася. У чацвер, пятніцу і сёння Нацбанк ужо купляў валюту, і такім чынам ўмацаваўся беларускі рубель», — сказала кіраўнік Нацбанка.

## Зямельныя ўчасткі, чэкі «Маёмасць», афармленне спадчыны і прыватызацыя

*(Працяг. Пачатак у нумары за 20 кастрычніка.)*



**Усе гэтыя тэмы былі ўзняты падчас «прамой лініі» ў рэдакцыі нашага выдання з удзелам старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгія Іванавіча Кузняцова. Нашымі чытачамі было зададзена больш за 40 пытанняў. Мы прапануем вам адказы на самыя актуальныя з іх.**

**— Паважаны Георгій Іванавіч, у нас тут бяда. Мы ніяк не можам атрымаць дом і 25 сотак у спадчыну. Афармляем зямлю ўжо другі год. Справа вось у чым. Раней суседзі пры афармленні сваіх дакументаў адабралі ў нас 5 сотак зямлі. Але мы з гэтым не згодны. Спецыялісты землеўпарадкавальнай службы і мясцовае кіраўніцтва зацягваюць нашу справу. Цяпер нас ніхто ўжо не слухае. Што рабіць?**

**Ларыса ХАМІН,** *Мядзельскі раён, вёска Нарач.*

СТАР 3

Генадзь ГАРБУК:

## «Я і сёння згадзіўся б на ролю Васіля...»

**Сустрэцца і пагутарыць з адным са старэйшых і «зорных» артыстаў Нацыянальнага тэатра імя Я. Купалы і вядомым акцёрам кіно, народным артыстам Беларусі і лаўрэатам дзяржаўных прэмій Генадзем Гарбукам пашчасціла ў Жабінцы, куды ён прыязджаў на пачатку месяца з Брэста як удзельнік Рэспубліканскага фестывалю беларускіх фільмаў. У той дзень у нас дэманстравалася новая мастацкая кінастужка «Талаш», аднак госць, выканаўца галоўнай ролі, абмовіўся: пазнаваць у ім дзеда Талаша гледачы яшчэ не звыкліся — нязменна згадваюць як стваральніка вобраза вяскоўага хлопца Васіля Дзятліка з даўняй тэлевізійнай пастаноўкі паводле рамана І. Мележа «Людзі на балоце». Яго добра ведаюць таксама са спектакляў, з тэлепастановак і фільмаў «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Трывожнае шчасце», «Плач перапёлкі», «Знак бяды», «Белыя Росы» і многіх-многіх іншых.**

СТАР 5

Віктар ГАНЧАРЭНКА:

## «Я ЎПЭЎНЕНЫ Ў СВАЁЙ КАМАНДЗЕ»



Фота Надзеі БУЖАН.

**Вялікі футбол зноў грукоча ў дзверы. Гэтым разам на парозе 3 тур групавога раўнда Лігі чэмпіёнаў, хатні матч барысаўскага БАТЭ і іспанскай «Валенсіі». Напярэдадні сустрэчы Віктар Ганчарэнка, галоўны трэнер нашага чэмпіёна, па традыцыі, адказаў на пытанні журналістаў.**

Чарговы сапернік БАТЭ, безумоўна, не «Рэал» і не касмічная «Барселона», але пра моц «Валенсіі» сведчыць тое, што яна штогод стабільна знаходзіцца сярод лідараў іспанскага футбольнага першынства. «Аранжавыя» — шасціразовы чэмпіён Іспаніі. Гэты клуб двойчы перамагаў у розыгрышах Кубка УЕФА і двойчы — у фіналах Кубка Кубкаў. Апошні раз «Валенсія» звярнула на сябе ўвагу ў еўракубках на пачатку нулявых, калі два разы запар удзельнічала ў фінале Лігі чэмпіёнаў, але так і не здолела заваладаць ганаровым трафеем.

СТАР 2

## ПАСТАНОВА

Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Аб выбранні Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Выбраць Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Рубінава Анатоля Мікалаевіча.

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУСЕЦКІ**

*19 кастрычніка 2012 года, г. Мінск. № 5 — СР5/I*

## ПАСТАНОВА

Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Аб выбранні намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Выбраць намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Русецкага Анатоля Максімавіча.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ.**

*19 кастрычніка 2012 года, г. Мінск. № 6 — СР5/I*

### ■ Увага! Прамая лінія

**МІНІСТР АБАРОНЫ БЕЛАРУСІ ПРАВЯДЗЕ 24 КАСТРЫЧНІКА ПРАМУЮ ТЭЛЕФОННУЮ ЛІНІЮ З НАСЕЛЬНІЦТВАМ**

Юрый Жадобін будзе на працягу гадзіны адказваць на пытанні грамадзян. Задаць пытанне можна будзе з 10.00 да 11.00 па тэлефоне (8 017) 297 29 20.

### ■ АНОНС

24 кастрычніка з 10.00 да 13.00 у Палацы культуры і спорта чыгуначнікаў адбудзецца **Кірмаш вакансій арганізацый Мінска.** У прагараме – сустрэчы з прадстаўнікамі кадравых службаў арганізацый, што маюць патрэбу ў кадрах, кансультацыі па пытаннях заканадаўства аб занятасці, аб выдзяленні субсідый для арганізацыі прадпрымальніцкай і рамесніцкай дзейнасці, аб магчымасцях прафесійнага навучання.

## ПАВЕЛІЧЭННЕ ТАРЫФАЎ НА ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ БУДЗЕ ЎЗВАЖАНЫМ

**Пра гэта паведаміў міністр энергетыкі Аляксандр Азярэц.**

Паводле яго слоў, зараз 25 працэнтаў насельніцтва «спальвае» столькі электрычнасці, колькі спажывае такой энергіі астатняя частка жыхароў краіны. Таму цяпер спецыялістамі разглядаецца некалькі варыянтаў дыферэнцаванай аплаты за электрычнасць. Апошні прапанаваны варыянт прадугледжвае ўвядзенне сацыяльнай квоты ад 150 да 250 кВт/г у месяц для розных відаў пліт (газавая, электрычная). На гэтыя квоты будзе дзейнічаць мінімальны тарыф аплаты. За аб'ём спажывання электрычнасці, большы за базавую квоту, але меншы за 300—400 кВт/г, прапануецца павялічыць тарыф аплаты прыкладна на 30 працэнтаў. За ўсю астатнюю электраэнергію нядбайныя спажыўцы будуць разлічвацца ўжо па сабекошце.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже земельных участков в частную собственность:**

**НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**

**1. Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома индивидуальной застройки (для размещения объектов усадебной застройки), расположенного по адресу: Минская область, Мядельский район, д. Тимошковщина, площадью 0,1700 га (кадастровый № 624083110801000030 с начальной ценой 140 000 000 рублей.**

**2. Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома индивидуальной застройки (для размещения объектов усадебной застройки), расположенного по адресу: Минская область, Мядельский район, д. Гатовичи, ул. Нарочанская, площадью 0,1691 га (кадастровый № 624083103601000237) с начальной ценой 250 000 000 рублей.**

Сумма задатка: 10% от начальной цены на р/с 3641061900110 в ЦБУ филиала № 619 АСБ Беларусбанк, г. Молодечно, код 769, УНН 600380436, ОКПО 04430816, код платежа 04002, Мядельский сельский исполнительный комитет.

**ПРОДАВЕЦ** – Мядельский сельский исполнительный комитет.

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА** – Мядельский сельский исполнительный комитет.

Условия и порядок оплаты победителем аукциона: разовый безналичный платеж в размере цены продажи объекта за вычетом задатка на р/с Мядельского сельского исполнительного комитета согласно протокола аукциона в течение 10 дней со дня получения протокола аукциона.

Победитель либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает затраты на формирование земельного участка, государственную регистрацию, а также расходы, связанные с публикацией объявления об аукционе в средствах массовой информации, согласно протоколу аукциона.

**ДОКУМЕНТЫ, ПРЕДОСТАВЛЯЕМЫЕ ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ**:

- заявление на участие;
- копия платежного документа, заверенная банком, о внесении задатка;
- паспорт или иной документ удостоверяющий личность или доверенность (удостоверенная нотариусом) представителя физического лица.

**КОНЕЧНЫЙ СРОК ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЙ** 23 ноября 2012 года до 16.00 по адресу: Минская область, г. Мядель, ул. 17 сентября, 7, каб. № 12.

**ДАТА, ВРЕМЯ МЕСТО И ПОРЯДОК ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА** – 28 ноября 2012 года в 11.00 по адресу: Минская область, г. Мядель, ул. 17 сентября, 7, каб. № 15.

**Тел. для справок: 8 01797 55-7-35, 8 01797 55-7-36, 8 01797 55-3-51, 8 01797 55-4-00.**

*Свидетельство № 27 от 31.07.2006 г. выд. Мядельским РИК. УНП 600380436.*

*На основании Решения Молодечненского районного исполнительного комитета № 694 от 24.08.2012 г.*

**Строительно-инвестиционное коммунальное унитарное предприятие «УКС-Сервис» г. Молодечно ПЕРЕИМЕНОВАНО в коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»**

УНП 600182305


# «РОЛЯ КАМІТЭТА ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ Ў СІСТЭМЕ ОРГАНАЎ УЛАДЫ ПАВІННА БЫЦЬ БОЛЬШАЙ»

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 кастрычніка, прымаючы з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра Якабсона, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

На сустрэчы ў цэнтры ўвагі былі пытанні выканання КДК даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўдасканалення дзейнасці галоўнага кантрольнага ведамства краіны. Прэзідэнт настойвае на тым, каб Камітэт дзяржкантролю выконваў большую ролю ў сістэме органаў улады. Прэзідэнт папярэдзіў кіраўніка КДК, што не трэба захапляцца справаздачамі і дакладамі, і перасцярог ад залішняй заарганізаванасці і бюракратыі.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што КДК павінен дзейнічаць больш жорстка ў пытаннях, якія адносяцца да яго кампетэнцыі і, галоўнае, прымаць адпаведныя рашэнні. «Калі фінансавая разведка, Дэпартамент фінансавых расследаванняў знайшлі недахопы — трэба прымаць рашэнні. Напрыклад, бачыце, што з расходаваннем дзяржбюджэту нешта не ў парадку, — прымайце рашэнні», — запатрабаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы закрануў праблемы кандытарскай галіны, якімі ён нядаўна займаўся. Прэзідэнт лічыць, што менавіта дзяржкантроль павінен быў вырашаць пытанні, якія там узніклі: «У краіне павінны ведаць, што ёсць Камітэт дзяржкантролю, які ў адпаведнасці са сваімі паўнамоцтвамі павінен прымаць рашэнні. Прыклад таго — «кандытарскія» разборкі на «Камунарцы». Гэта пытанне КДК, замест Прэзідэнта там павінен быў знаходзіцца старшыня КДК і вырашаць гэтыя праблемы. Вы павінны, безумоўна, стаяць на варце інтарэсаў нашага народа, асабліва што тычыцца ўласнасці». Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў аб недапушчэнні надалей праблем, падобных да тых, што паўсталі ў кандытарскай галіне.

Аляксандр Якабсон праінфармаваў Прэзідэнта аб тым, як рэалізуецца ўказ № 332 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні кантрольнай (нагляднай) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», які ўступіў у сілу з 1 кастрычніка. Па словах кіраўніка КДК, ужо на першых этапах рэалізацыі ўказа ёсць сур'ёзныя зрухі. Указ пазітыўна ўспрыняты дзелавой грамадскасцю краіны. Асноўная яго сутнасць — аналітыка, апярэджанне, непасрэдна кантрольныя дзеянні, накіраваныя на тое, каб не дапусціць злачынства.

Старшыня КДК праінфармаваў Прэзідэнта аб некаторых пытаннях мясаперапрацоўчай галіны, аб праблемах, звязаных з адраджэннем зямель на чарнобыльскіх тэрыторыях. Кіраўнік дзяржавы ў сувязі з гэтым даў шэраг даручэнняў.

На сустрэчы таксама абмяркоўваліся пытанні выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы. «Мы кантралюем гэты бюджэт і ўнеслі некаторыя ініцыятывы, каб выкарыстоўваць рэзервовыя рэшткі бюджэту», — сказаў Аляксандр Якабсон. Акрамя таго, ён далажыў Прэзідэнту аб выкананні даручэнняў па рэканструкцыі малочнатаварных ферм, аб завяршэнні палявых работ, а таксама аб маючай адбыцца кадравай аптымізацыі ў КДК.

## БЕЛАРУС, ЯКІ ЛІЧЫЎСЯ ЗНІКЛЫМ БЕЗ ВЕСТАК, ВЯРНУЎСЯ НА РАДЗІМУ ПРАЗ 2 ГАДЫ

Непрацуючы жыхар Мядзельскага раёна 1971 года нараджэння лічыўся зніклым без вестак з 1 студзеня 2010 года. У міліцыю аб зніклненні чалавека заявілі яго сваякі, якія нічога не ведалі пра яго месцазнаходжанне. Арыенціроўкі на на яго былі накіраваны ва ўсе органы і падраздзяленні ўнутраных спраў Беларусі.

І вось зніклы без вестак, жывы і здаровы, прыляцеў у Мінск 20 кастрычніка самалётам з Італіі. У аэрапорце яго затрымалі супрацоўнікі станічнага АУС на паветраным транспарце падчас праходжання памежнага кантролю, чаму прыезджы быў нямала здзіўлены. Ён і не падазраваў, што яго шукаюць. Па яго словах, ён з'ехаў больш за 10 гадоў таму на заробкі ў Заходнюю Еўропу. Свой мабільны, з'язджаючы, мужчына папросту забыўся. Доўгі час ён працаваў дальнабойшчыкам у адной з фірмаў Партугаліі. А сёлета беларус вырашыў вярнуцца дадому.

Знойдзенага сваяка супрацоўнікі транспартнай міліцыі перадалі яго сястры, якая прыехала за ім у аэрапорт.

**БЕЛТА.**

■ Добрая навіна

# У ШЧУЧЫНСКІМ РАЁНЕ АДКРЫЛАСЯ НОВАЯ САЦЫЯЛЬНАЯ ЎСТАНОВА



**НА днях у Шчучынскім раёне адкрылася аддзяленне кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей і інвалідаў. Удзел у яго адкрыцці прыняў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Пётр ГРУШНІК.**

У нашай рэспубліцы, зрэшты, як і ва ўсім свеце, адзначаецца няўхільны рост колькасці адзінокіх і адзінока пражываючых пажылых людзей. І часта паклапаціцца пра іх, акрамя дзяржавы, проста няма каму. Між тым старасць кожнага чалавека павінна быць камфортнай і годнай. Таму патрэба ва ўстановах сацыяльнага прызначэння будзе толькі ўзрастаць.

У Шчучынскім раёне ёсць дзве бальніцы сястрынскага догляду і Дом міласэрнасці ў аграгарадку Каменка, дзе адзінокіх пажылых людзей дагдядаюць каталіцкія манахіні. Тым не менш у сакавіку 2011 года мясцовы райвыканкам прыняў рашэнне аб рэканструкцыі адной з бальніц раёна пад аддзяленне кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей і інвалідаў, якое будзе вырашаць надзённыя праблемы людзей, што маюць патрэбу ў гэтай дапамозе.

Аб'ект быў уключаны ў інвестыцыйную праграму. Зараз у яго ўкладзена ўжо больш за 2,5 млрд рублёў. Плануецца, што аддзяленне кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей і інвалідаў збярэ пад сваім дахам больш за два дзясяткі чалавек, якія змогуць знайсці ў гэтым доме клопат, увагу, цяпло і добрыя адносіны, а можа, і добрых сяброў.

У аддзяленні створаны ўсе ўмовы для камфортнага жыцця. «Самае галоўнае ў тым, каб мы не фармальна падышлі да вырашэння гэтай праблемы: адкрылі і забыліся. Тут будуць жыць людзі са сваімі праблемамі, пытаннямі, балячкамі. Людзі, якім патрэбны стасункі, разуменне, ласка, любоў. Я хацеў бы, каб гэта разумелі ўсе супрацоўнікі, якія будуць працаваць з людзьмі», — сказаў на адкрыцці аддзялення першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Пётр Грушнік.

**Святлана БУСЬКО.**
**Фота аўтара**

■

# «Я ЎПЭЎНЕНЫ Ў СВАЁЙ КАМАНДЗЕ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Санцьяга Канісарэс, Жуслен Англама, Джон Кар'ю, Гаіска Мендзьета, Кілі Гансалес, Пабла Аймар, Маўрысіа Пелегрыні — прозвішчы тых вядомых майстроў, якія кавалі незабыўныя перамогі для балельшчыкаў. Між іншым, каманду зараз трэніруе той самы аргенцінец Пелегрыні. І калі ў Лізе чэмпіёнаў «Валенсія» дзеліць у групе F другое месца з «Баварыяй», дык у чэмпіянаце Іспаніі каманда пакуль нават не ўваходзіць у пяцёрку лепшых.

— З гэтага сезона з «Валенсіяй» працуе новы трэнер, — кажа Віктар Ганчарэнка. — У яго ёсць уласнае бачанне. Напэўна, сёлетні стан каманды адрозніваецца ад леташняга, але ў нас даволі добры падбор футбалістаў. У асаблівым прадстаўленні каманда патрэбы не мае. У апошнія сезоны яна знаходзіцца на трэцім месцы пасля «Барселоны» і «Рэала».

Цікава, што ва ўсіх шасці сустрэчах з іспанскімі камандамі БАТЭ саступіў з агульным лікам 1:18. Вось такія адмоўныя паказчыкі. Аднак Віктар Міхайлавіч лічыць, што «любыя серыі заканчваюцца», а статыстыка і існуе для таго, каб яе «ламалі».

— Я ўпэўнены ў сваёй камандзе. Яна знаходзіцца ў добрым гульнявым тонусе, — падкрэсліў Ганчарэнка.

Барысаўчане апошнім часам сталі сапраўдным ньюсмейкерам у еўрапейскім футбольным асяродку. Спачатку БАТЭ перамог у гасцях французскі «Ліль», а пасля феерычна на мінскім «Дынама» перайграў нямецкую «Баварыю». Зараз БАТЭ ўзначальвае свой квартэт і мае шанцы выйсці ў далейшую стадыю Лігі чэмпіёнаў. Наконт апошніх вынікаў трэнер разважае даволі мудра: «Мы павінны забыцца на тое, што ёсць табліца. Неабходна зрабіць так, каб адхіліцца ад знешніх фактараў. Пастараемся зрабіць усё неабходнае для таго, каб перамагчы».

Матч сапраўды абяцае быць не проста цікавым, а вельмі напружаным. Добры вынік БАТЭ ў гэтай сустрэчы здолее пэўным чынам акрэсліць шлях каманды ў сёлетніх еўракубках. Спадзяёмся, саперніцтва з вядомай «Валенсіяй» наш чэмпіён будзе пры запоўненых трыбунах «Дынама». Для тых, хто яшчэ не ведае: пачатак матча — у 21:45. «Хварэем» разам за БАТЭ!

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# МІСІЯ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Ці існуе ў рэчаіснасці Саюзная дзяржава Расіі і Беларусі? Што яна дае простым грамадзянам? Якая ёй наканавана будучыня? Гэтыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў тэлевізійнага моста «Саюз Беларусі і Расіі: у чым выйгрыш?», які адбыўся 17 кастрычніка.**

Тэлемост злучыў аўдыторыю адразу ў чатырох гарадах: Маскве, Мінску, Санкт-Пецярбургу і Томску. Гаворка атрымалася шчырая і прамая: ад праблем і вострых тэм запрошаныя эксперты не ўхіляліся.

«Саюзная дзяржава выканала вельмі важную гістарычную місію. Яна стала той мадэллю пабудовы саюзніцкіх адносін, якая заклала аснову для наступных інтэграцыйных праектаў», — выказаў сваю думку галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка» Вадзім Гігін. Ён дадаў, што ў бліжэйшыя 5-15 гадоў трэба чакаць далейшага інтэнсіўнага развіцця інтэграцыйных праектаў на еўразійскай прасторы, да якіх будуць далучацца новыя краіны. А гэта, па яго словах, можа прывесці да ўзнікнення новай канфедэратыўнай дзяржавы.

Генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва «БелТА» Дзмітрый Жук лічыць галоўным дасягненнем саюзнага будаўніцтва вырашэнне канкрэтных сацыяльных і бытавых праблем людзей. У якасці яскравага прыкладу ён прывёў лёс журналіста свайго агенцтва Васіля Малашанкава, які прыехаў з Сібіры, мае расійскі пашпарт, працуе ў Беларусі і не адчувае пры гэтым ніякіх праблем.

Свабода перамяшчэння, вольны выбар месца жыхарства, роўныя ўмовы пры навучанні, працаўладкаванні — гэта канкрэтныя і адчувальныя вынікі 15 гадоў інтэграцыі паміж Расіяй і Беларуссю. Менавіта такая думка гучала ў выступленнях прадстаўнікоў беларускіх дыяспар. У Санкт-Пецярбургу мясцовых беларусаў прадстаўляў Мікалай Русакевіч, а ў Томску — Любоў Адаскевіч. Абое ўзначальваюць адпаведныя рэгіянальныя беларускія нацыянальна-культурныя аўтаноміі. Дарэчы, у Беларусі пастаянна пражывае 785 тысяч рускіх, а таксама каля 90 тысяч грамадзян Расійскай Федэрацыі. Беларусаў у Расіі — больш за 521 тысячу чалавек.

Вельмі актуальнымі з'яўляюцца і пытанні роўных умоў пры атрыманні адукацыі, асабліва вышэйшай. Зараз у расійскіх ВНУ навучаецца 20 тысяч беларусаў, у сваю чаргу, у Беларусі спрабуюць атрымаць дыпломы 2 тысячы расійскіх грамадзян.

Палітолаг Кірыл Коктыш перавёў гаворку ў плоскасць эканамічных адносін, заявіўшы, што менавіта размеркаванне энергарэсурсаў, нафтавай рэнты з'яўляецца асновай для існавання Саюзнай дзяржавы. У яго словах гучаў пэўны скепсіс адносна перспектыў яе развіцця, асабліва на фоне стварэння Адзінай эканамічнай прасторы Расіі, Беларусі і Казахстана, а таксама ўступлення Расійскай Федэрацыі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. З ім не пагадзіўся галоўны рэдактар «Народнай газеты» Уладзімір Андрыевіч, які лічыць, што асноўным недахопам у асвятленні беларуска-расійскай інтэграцыі з'яўляецца слабая дэманстрацыя журналістамі магчымасцяў Саюзнай дзяржавы, а таксама няправільнае яе пазіцыянаванне толькі «вакол нафтавай трубы». Кіраўнік прадстаўніцтва тэлерадыёаб'яднання Саюза ў Мінску Тэнгіз Думбадзе прама заявіў: «У пытаннях супрацоўніцтва Беларусі і Расіі журналісты заўжды павінны шукаць станоўчыя бакі».

Многія ўдзельнікі тэлемоста вызначалі ролю сродкаў масавай інфармацыі як найважнейшы складнік інтэграцыйных працэсаў. СМІ — не простыя назіральнікі, але і ўдзельнікі саюзнага будаўніцтва. Ад іх залежыць, якім будзе агульная будучыня Расіі і Беларусі. «Важны складнік PR у межах беларуска-расійскай інтэграцыі — захаванне агульнай культурнай спадчыны і яе прапаганда», — адзначыла загадчыца аддзела дыяспар Інстытута краін СНД Аляксандра Дакучаева.

Нягледзячы на пэўныя спрэчкі, якія ўзнікалі паміж асобнымі экспертамі, што ўдзельнічалі ў дыскусіі, ніхто не ставіў пад сумненне неабходнасць тых працэсаў, якія былі распачаты Аляксандрам Лукашэнкам і Барысам Ельцыным у 1996 і 1999 гадах. Нават выказвалася думка, што былы расійскі прэзідэнт пайшоў насустрач ініцыятывам свайго беларускага калегі, быццам бы выпраўляючы віну за развал Савецкага Саюза.

Тое, што атрымалася ўжо зараз у адносінах паміж Расіяй і Беларуссю, з'яўляецца карысным прыкладам для развіцця інтэграцыі на постсавецкай прасторы — такі агульны лейтматыў выступлення падчас тэлемоста.

**Уладзімір ЗАГОРСКІ,** *Масква.*


**Внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества "МОТОВЕЛО" (г. Минск, проспект Партизанский, 8) состоится 29 октября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8 в заочной форме**

Орган, по решению которого созывается общее собрание акционеров: Наблюдательный совет ОАО «МОТОВЕЛО».

**Повестка дня:**

1. Об утверждении результатов закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции ОАО «МОТОВЕЛО».
2. Об утверждении решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО».
3. Об утверждении изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО».
4. Об утверждении цены выкупа простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО» по требованию акционеров.

Бюллетени для заочного голосования акционеры получают с 25 октября по 26 октября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00), под роспись при предъявлении паспорта (для представителей акционеров – паспорта и доверенности).

Акционеры обязаны возвратить заполненные бюллетени для заочного голосования по указанному адресу не позднее 17.00 26 октября 2012 г.

С проектом решений собрания, решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО», изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО», формой и текстом бюллетеня для заочного голосования акционеры могут ознакомиться с 25 октября по 26 октября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00).

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «МОТОВЕЛО» по состоянию на 22 октября 2012 г.

Выкуп акций по требованию акционеров производится по номинальной стоимости. Заявления от акционеров о выкупе акций по требованию акционеров принимаются 29 октября 2012 г.

*УНП 190017558*


# Зямельныя ўчасткі, чэкі «Маёмасць», афармленне спадчыны і прыватызацыя

**(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)**

— Я так разумею, што ў вашым выпадку існуе спрэчка з суседзямі наконт сумеснай мяжы. Зараз вам трэба зрабіць так. Афіцыйна напісаць заяву ў сельскі выканкам аб вырашэнні зямельнага канфлікту. Сельскі выканкам вымушаны будзе стварыць адпаведную камісію, у складзе якой будуць задзейнічаны неабходныя спецыялісты. Гэтая камісія павінна прыбыць на месца вашага зямельнага ўчастка, дзе ў прысутнасці вас і суседа будзе прынята рашэнне аб зямельнай спрэчцы. Паводле вынікаў работы камісіі будзе складзены адпаведны дакумент, які адлюстроўвае ўсе акалічнасці па гэтай справе. Потым гэты акт камісіі будзе разглядацца на пасяджэнні мясцовага выканкама і зацверджаны.

**— Але нас не слухаюць, таму, можа, і заяву не возьмуць...**

— Заяву можна накіраваць у выканкам і заказным пісьмом па пошце. Чыноўнікі будуць вымушаны прыняць вашу заяву.

**— А калі рашэнне выканкама будзе не на нашу карысць?**

— Тады вы маеце права адстойваць сваю праўду ў судзе. Другога спосабу вырашыць вашу зямельную спрэчку няма.

**☎— Мы як маладая сям'я атрымалі зямельны ўчастак у горадзе Смалявічы, дзе будуем індывідуальны жылы дом. Пры будаўніцтве карыстаемся льготным крэдытам дзяржавы. Так адбылося, што цяпер вада з боку суседняга поля сцякае менавіта на наш участак. Вада ўжо знішчыла дарогу да ўчастка і сур'ёзна парушыла яго рэльеф. Пачынаюцца праблемы з фундаментам дома. Мясцовыя ўлады адказнасці ў гэтай сітуацыі на сябе не бяруць. На ўсе нашы заявы да гарадскіх чыноўнікаў атрымалі толькі адпіскі, дзе адмаўляюць дапамагчы ў гэтай складанай сітуацыі...**

**Анастасія Аляксандраўна,** *г. Смалявічы.*

— Сітуацыя ў вас і сапраўды складаная. Калі раённыя ўлады не жадаюць вам дапамагаць, то паспрабуйце звярнуцца да адпаведных спецыялістаў абласного выканкама. Калі і там вы не знойдзеце разумення, то застаецца адзін шлях абароны сваіх правоў — праз суд.

**☎— Маю жаданне прыватызаваць дом у вёсцы. Хачу выкарыстаць для гэтага і чэкі «Жыллё». Але ў мяне іх не бяруць. Чаму?**

**Іосіф Пабярэжын,** *Браслаўскі раён.*

— Зараз хто з'яўляецца ўласнікам гэтага дома?

**— Раней ён быў саўгасны, а пасля аб'яднання структур стаў належаць нашаму таварыству «Аграсэрвіс».**

— Атрымліваецца, што гаспадаром дома з'яўляецца акцыянернае таварыства. Гэта яго прыватная ўласнасць. А чэкі «Жыллё» выкарыстоўваюцца толькі для прыватызацыі дзяржаўнага жылля. Атрымліваецца, што ў вашым выпадку гутарка можа ісці толькі аб продажы вам гэтага дома. Ніякіх выключэнняў тут няма. Адзінае, што я вам параю, гэта ўдакладніць, ці сапраўды дом належыць акцыянернаму таварыству на праве ўласнасці. Бываюць выпадкі, калі аб'екты жылога фонду перадаюцца акцыянерным таварыствам па дагаворах бязвыплатнага карыстання. У гэтай сітуацыі дом застаецца ва ўласнасці дзяржавы і ёсць магчыма прыватызаваць з выкарыстаннем і чэкаў «Жыллё».

**☎— Ці могуць зараз грамадзяне Расіі, якія атрымалі жылы дом у спадчыну ў Беларусі, аформіць яго і зямельны ўчастак у прыватную ўласнасць?**

**Аксана Кастунова,** *г. Брэст.*

— Калі ў спадчынадаўца ўжо быў аформлены зямельны ўчастак у прыватную ўласнасць, то і спадчыннік — грамадзянін іншай краіны — гэтае права ўласнасці пераходзіць. Адпаведна такое правіла існуе і па зямельных участках, якія былі ў спадчынадаўца на праве пажыццёвага валодання з правам перадачы ў спадчыну. Спадчыннік атрымае зямельны ўчастак у пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну. Аднак калі ўчастак быў ужо аформлены грамадзяніну іншай дзяржавы ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну, то выкупіць ва ўласнасць гэты ўчастак замежніку ўжо нельга. Бываюць выпадкі, калі зямельны ўчастак першапачаткова не быў аформлены спадчынадаўцам, тады гэты ўчастак будзе афармляцца іншаземцу толькі на праве арэнды.

**☎— Я ў пачатку 90-х гадоў пабудаваў кааператыўны гараж ад сельгастэхнікі. Зараз гэтай арганізацыі юрыдычна ўжо няма. Таму і зніклі ўсе дакументы аб выдзяленні зямельных участкаў пад будаўніцтва гаражоў. Гэтага рашэння (аб выдзяленні зямельных участкаў) няма нават у абласным архіве. Што нам цяпер рабіць, каб аформіць гаражы ва ўласнасць?**

**Мікалай Хропік,** *г. Беразіно.*

— Вам трэба высветліць тое, калі і якім чынам былі створаны гэты кааператыў. Магчыма, што такі кааператыў як юрыдычную асобу трэба будзе стварыць занава. Потым кааператыў павінен звяртацца ў гарвыканкам аб выдзяленні яму зямельнага масіву пад гаражамі, для іх абслугоўвання. Далей узнікае самае складанае пытанне — аб саміх гаражах. Тут трэба шукаць любыя дакументы аб будаўніцтве канкрэтнымі асобамі гэтых гаражоў. Калі і тут дакументаў няма, то застаецца апошні шлях — звяртацца ў суд, каб ужо ён прызнаў права ўласнасці грамадзян на такую нерухомасць. Гэта можна зрабіць толькі ў тым выпадку, калі ўсё спачатку было зроблена па законе. Галоўнае, каб гэта не было самавольнае будаўніцтва людзей, калі зямля выканкамам на гэтыя мэты ніколі не прадастаўлялася. Бо самавольнае будаўніцтва ўзаконіць практычна немагчыма.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**(Заканчэнне будзе.)**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

Минский городской территориальный фонд государственного имущества извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже объекта государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества (далее – аукцион) который состоится **15 ноября 2012 г. в 15.30** по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, конт. тел. (8017) 200 20 89, каб 227.

На аукцион выставляются:

| | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания |
| **Место нахождения недвижимого имущества** | г. Минск, ул. Павловского, 58, военный городок № 220 «Сосны» | г. Минск, ул. Брикета Ф.А., д. 30 |
| **Начальная цена предмета аукциона** | 5 246 740 127 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 5 169 155 620 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 77 584 507 белорусских рублей) | 2 110 530 800 белорусских рублей, в том числе: начальная цена недвижимого имущества – 945 580 550 белорусских рублей, начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 1 164 950 250 белорусских рублей |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета** | 1 000 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе** | 400 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе |
| **Продавец недвижимого имущества** | ГУ «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», 220031, г. Минск, ул. Основателей, 24, тел. (8 017) 266 52 33; (8029) 114 39 43 – осмотр объекта | ГУ «Белорусский государственный ветеринарный центр», г. Минск, ул. Красная, д. 19А, тел.(8017) 290 42 79, (8017) 290 42 73 |
| **Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества** | Общая площадь – 0,1478 га , вид вещного права – право аренды земельного участка; кадастровый номер земельного участка – 500000000002005958; срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 0,5450 га, в том числе 0,1895 га с ограничениями в использовании земель – охранные зоны линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений; кадастровый номер земельного участка – 500000000006003619; вид вещного права – право аренды земельного участка, срок аренды – 5 лет |
| **Характеристика недвижимого имущества** | Общая площадь – 6400,2 кв.м, количество этажей – 6; строительство начато в 1990 году; стены – железобетонные панели, кирпичные; перекрытия – железобетонные плиты; перегородки – железобетонные, частично – кирпичные; степень готовности объекта – 44% | Имущество представляет собой не завершенное строительством незаконсервированное здание административно-хозяйственного назначения с инвентарным номером 500/U-55117 по ул. Брикета, 30, кирпичное, площадь здания по ПСД – 6643 кв.м, площадь застройки – 1517 кв.м. Строительство объекта начато в 1992 году, приостановлено – в 1994. Инженерные коммуникации и элементы благоустройства отсутствуют. Степень готовности объекта – 11,4%. |
| **Условия использования недвижимого имущества** | В соответствии с проектным решением градостроительного проекта детального планирования | Под научно-образовательные объекты, учреждения здравоохранения, культуры, предприятия торговли и общественного питания, медицины, административно-деловые учреждения, физкультурно-оздоровительные, спортивно-тренажерные залы, бассейн |
| **Условия использования земельного участка** | В соответствии с утвержденной градостроительной документацией – для дальнейшего использования объекта под общественные объекты для обслуживания населения социального, культурно-бытового, торгового назначения и учреждения здравоохранения, а также под административно-деловые объекты и научно-образовательные учреждения | В соответствии с утвержденной градостроительной документацией – для размещения научно-образовательных объектов, учреждений здравоохранения, культуры, предприятий торговли и общественного питания, медицины, административно-деловых учреждений, физкультурно-оздоровительных, спортивно-тренажерных залов, бассейнов |
| **Условия по продаже недвижимого имущества** | Без условий | Без условий |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 13 ноября 2012 года включительно.**

Извещения о проведении аукционов ранее опубликованы:
по лоту № 1 – в газете «Звязда» от 07.09.2012 № 173 (27288);
по лоту № 2 – в газете «Звязда» от 12.09.2012 № 176 (27291).

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По заявлению победителя аукциона (претендента на покупку) Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка. Указанное заявление подается победителем аукциона (претендентом на покупку) в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка принимается Минским горисполкомом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в порядке, установленном решением Минского горисполкома от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским горисполкомом) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский горисполком копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества. В тот же срок Минский горисполком передает победителю аукциона (претенденту на покупку) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества на срок не более одного года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей может быть предоставлена при заключении договора купли-продажи по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

Извещение о проведении аукциона размещено на официальных интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета (www.minsk.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (www.gki.gov.by).

Осмотр объектов на местности участниками аукциона производится Продавцами.

# «БЛІШЧАЎ МЕТАЛ НА ФОНЕ ТКАНАГА ЎЗОРУ»



**Ці задумваліся вы калі-небудзь аб прызначэнні самавараў? Вядома, па адказ у кішэню не палезеце. Толькі на ваша «каб гарбату піць» чалавек дасведчаны адразу запярэчыць, папросіць удакладніць — як і дзе. Усё проста: прызначэнне самавара залежыць ад яго тыпу.**

*Той пузаценькі, які нам добра вядомы, а дакладней, самавар-шар, лічыцца салонным. Мець яго ў сваім інтэр'еры раней маглі сабе дазволіць толькі заможныя гаспадары, якія любілі збірацца за кубкам гарбаты, каб абмеркаваць навіны, папляткарыць.*

*Іншая справа — самавар-цыліндр. Такі тып самавараў быў прадметам царскага стала. Аднак з цягам часу ён пачаў трапляцца і ў інтэр'еры сярэднестатыстычнага жыхара. Для прасцякоў, вядома, гэта была раскоша.*

*Самай вялікай ёмістасці былі так званыя сямейныя самавары. Сем'і ў тыя часы былі вялікімі. Таму такія самавары былі разлічаны на тое, каб гарбаты хапіла на ўсіх, прычым заварыўшы кіпень адзін раз.*

*Самавар-павук знешне сапраўды павукападобны. Яго аб'ём параўнальна невялікі. А ўсё таму, што такі самавар бралі з сабой у дарогу. Устойлівыя «ногі» на ім якраз для таго, каб было зручна паставіць яго ці на століку ў цягніку, ці на посцілку на пікніку.*

*Вельмі цікавы тып — самавар-груша, ці самавар-дуля. Невялікі па аб'ёме, ён таксама быў атрыбутам заможных людзей.*

*Самавар-чарка мае два падтыпы: «чарка гладкасценная» і «чарка з гранню» — залежыць ад дэкаратыўнага афармлення. Прызначэнне такога самавара ўніверсальнае.*

Дасведчаным у самаварах чалавекам я стала літаральна нядаўна. Дакладней, пасля таго, як наведала выставу Лідскага гісторыка-мастацкага музея «Блішчаў метал на фоне тканага ўзору». Гэта сумесны праект музея і прыватнага калекцыянера Андрэя Фішбайна. На ёй прадстаўлены работы ручнога ткацтва народных умельцаў Лідчыны 40-90-х гадоў XX стагоддзя і калекцыя металічнага посуду канца XIX — пачатку XX стагоддзя.





— Гэта не выпадковы выбар калекцыянера і прапанаваная яму форма супрацоўніцтва, — зазначыла **старшы навуковы супрацоўнік Лідскага гісторыка-мастацкага музея Таццяна НІКІФАРАВА** *(на фота)*. — Андрэй Фішбайн вельмі даўні сябар музея, з якім мы падтрымліваем партнёрскія сувязі. Мы лічым яго нават калегам, нягледзячы на тое, што гэты чалавек вельмі далёкі ад музейнай справы. Ён сур'ёзны калекцыянер, які не толькі збірае пэўныя рэчы ці прадметы, але і займаецца іх даследаваннем. Не памылюся, калі назаву яго сапраўдным патрыётам матэрыяльнай культуры горада: шматлікія каштоўныя рэчы, якія трапляюць да калекцыянера, ён прадае музею за зусім сімвалічныя грошы. Прычым з умовай, каб гэтыя прадметы не пакідалі межы рэгіёна, бо яны — частка нашай культуры. Самае галоўнае, на думку калекцыянера, не проста сабраць цікавую калекцыю, а дакрануцца да нейкай часткі мінулага.

Вярнуся да самавараў. У тыя часы гэты посуд быў па кішэні толькі людзям заможным. Ужо ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя з металаў горшай якасці і без мастацкага аздаблення пачалі выпускаць самавары, якія маглі набыць сабе і простыя людзі. На выставе, праўда, такіх няма. Тут прадстаўлены ўзоры самых шыкоўных самавараў. Адны імёны вытворцаў нагадваюць пра іх каштоўнасць: браты Шамарыны, браты Баташавы, браты Варанцовы, Іван Казлоў.

— Вось вельмі цікавая калекцыя, — расказвае Таццяна Нікіфарава. — Гэта чайнікі!

— Якія шыкоўныя і прыгожыя!

— І ўзрост у іх такі значны, што, стоячы побач, ім можна аддаваць чэсць. Уявіце сабе: амаль усе чайнікі з гэтай калекцыі часоў Першай сусветнай вайны! Пра гэта нам стала вядома з пазнак, якія ёсць на кожным з іх. Цяжка ўявіць, што менавіта з такім чайнічкам салдаты на станцыях выбягалі па кіпень! Вядома, сёння яны ўсе адрэстаўраваныя. Аднак не думаю, што іх першапачатковы выгляд быў нашмат горшым.

— Тут некалькі тыпаў чайнікаў. Відаць, салдаты іх выкарыстоўвалі ў розных мэтах?

— Сапраўды! Мы бачым тут вялікі палкавы чайнік, разлічаны на цэлую роту ці нават батальён. З сярэдняга магла напіцца пэўная група людзей. Ёсць нават чайнік-кафейнік. Вядома, ужо не салдацкі. З яго, верагодна, пілі гарбату ці каву высокапастаўленыя асобы.

На зайздрасць любой сучаснай гаспадыні — калекцыя патэльняў. Самых розных. Для прыгатавання шматлікіх відаў страў. На іх хоць сёння вары, смаж, пячы, тушы...

А калекцыя прымусаў прадстаўлена экспанатамі розных краін-вытворцаў. Нямала калекцыянер пападарожнічаў па свеце! Затое сёння мы можам параўнаць нямецкія прымусы са шведскімі, рускія з канадскімі...

— Вельмі цікавая калекцыя газніц, — працягвае экскурсавод. — Праўда, не ўсе лямпы тут газавыя і не ўсе фабрычнай вытворчасці. Напрыклад, гэтая, якая ўзначальвае «парад», не што іншае, як самаробная бліндажная лямпа часоў Першай сусветнай вайны. Ёсць і яшчэ адзін унікальны экспанат — дакладная копія першай газніцы, вынайдзенай Ігнатам Лукасевічам. А гэтыя тры «прыгажуні» — беларускі гонар. Такія лямпы выпускалі ў Магілёве. Безумоўна, імі карысталіся толькі заможныя сем'і. Яны ўсе шкляныя. Прычым шкло, з якога яны зроблены, рознае: бясколернае, блакітнае.

Не была б паўнавартаснай калекцыя, каб не быў на ёй прадстаўлены і посуд утылітарнага прызначэння. Напрыклад, тазік і коўш — для мыцця. Начны гаршчок. І нават металічная грэлка, у якую налівалася гарачая вада.

Другая частка выставы — калекцыя посцілак і дываноў. Гэтыя экспанаты збіраліся супрацоўнікамі музея на працягу многіх гадоў. Таму калекцыя атрымалася вельмі змястоўнай і выразнай.

Самы стары дыван датуецца 1948 годам. Работа вельмі незвычайная: на дыване вытканы год, калі праца была завершана, а таксама ініцыялы ткачыхі — «М. С. Н.», якія, на жаль, расшыфраваць не ўдалося. Аднак, нягледзячы на гэта, якраз работы з такімі пазнакамі спецыялісты адносяць да ўнікальных і каштоўных. Цікава і тое, што тканыя дываны і посцілкі маюць «расшыфроўку». Напрыклад, сюжэт гэтай работы.

— Сорак восьмы год, толькі скончылася вайна. Вакол разруха, голад, неўладкаванасць, — тлумачыць супрацоўнік музея. — І ў той жа час у рабоце пераважае чырвоны колер, што сімвалізуе каханне. Чытаем арнамент: у цэнтры кампазіцыі прысутнічаюць ружы — таксама сімвал кахання; птушкі, вытканыя галоўкамі адна да адной, — сімвал узаемнасці; ромб — сімвал сям'і; так званы «багач» — багацце, дабрабыт. Плюс да гэтага ў сюжэце арнаменту «лётаюць» нават матылькі. 1948 год! А чалавек у сваёй працы гаворыць пра каханне, верыць у лепшае жыццё! Адзін гэты дыван — цэлае паданне! Таму важна разумець: людзі не ткалі сімволіку дзесьці далёка, за межамі краіны, яны адлюстроўвалі ў сваіх работах тыя эмоцыі і перажыванні, што адчувалі ў той момант.

Аўтары посцілак і дываноў вельмі розныя. Вядома, неаднолькавыя і іх творы. Для параўнання — работа, пазначаная як «Н. І. 1954 год». Калі ў папярэднім дыване сімволіка сведчыць пра зараджэнне кахання, то тут арнамент «распавядае» пра сям'ю, якая ўжо склалася. Эмацыйна спакойны зялёны колер — сімвал дабрабыту, дастатку. Вінаградная лаза азначае багацце. Зноў жа тэма кахання нікуды не сыходзіць, пра што нагадваюць вытканыя ружы. У цэнтры ўсё той жа ромб — сімвал сям'і.

На выставе можна ўбачыць нават шлюбную посцілку. Як вядома, раней дзяўчына, выходзячы замуж, збірала пасаг, у якім павінна было быць не менш за дзесяць посцілак і дываноў. Прыцягвае ўвагу маленькая посцілка — як аказалася, прыложкавы дзіцячы дыван. Як прызналася Таццяна Нікіфарава, падобны экспанат у сваёй музейнай практыцы яна сустрэла ўпершыню.

— На дыване адлюстравана рыжая лісічка. Можна зрабіць выснову, што гэта жанр анімалістычны, што ўвогуле вялікая рэдкасць! Мне ніколі не сустракаліся беларускія посцілкі і дываны з вытканымі жывёламі. Унікальная работа, датаваная 60-мі гадамі!

Посцілка, якая вельмі выразна адрозніваецца па сваім арнаменце ад іншых работ, адлюстроўвае сваё тэрытарыяльнае паходжанне. Гэты твор прадстаўляе рэгіён Панямонне, пра што сведчыць суцэльны ўзор, які сімвалізуе ваду. Сапраўды, калі глядзіш на посцілку, бачыш кругі вады, якія разыходзяцца.

У цэнтры выставы — экспазіцыйны комплекс «Ля самавара...». Адразу ўспамінаецца вядомая карціна мастака Барыса Кустодзіева «Купчыха за чаем«. Стаяць два крэслы, стол, на якім — цэлы самаварны камплект, які ўдалося набыць калекцыянеру. Самавар, паднос, імбрычак, смятаннік і капельнік. Усе гэтыя прадметы зроблены ў Санкт-Пецярбургу ў 1909 годзе. Таксама на стале — усе тыя прадметы, якія сапраўды маглі быць у інтэр'еры чалавека вышэйшага саслоўя: талеркі, цукарніца, чаркі, падсвечнікі і нават люстэрка ў прыгожым абрамленні.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара.**

## ПЕРАМОГА «БАЗАРНАЙ» МАНЕТЫ

**Беларускай манеце з выявай галоўнай сцэнічнай пляцоўкі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» — амфітэатра і іншых знакавых для Віцебска будынкаў — прысудзілі другое месца на міжнародным нумізматычным конкурсе, які прайшоў у Італіі. Штогод на гэтым прэстыжным конкурсе ўзнагароды атрымліваюць самыя прыгожыя манеты. Сёлета былі прадстаўлены 42 манеты з 12 краін.**

Конкурс у Італіі праводзіўся ў дзявяты раз. Журы конкурсу адзначыла беларускую памятную манету за арыгінальнасць адлюстравання ландшафту Віцебска, а таксама сюррэалістычны паказ складанай дынамічнай кампазіцыі.




**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПАТУШЫЦЬ ПАЖАР І... ПАБЯЛІЦЬ ПЕЧ

**ДАПАМОГА выратавальнікаў можа быць запатрабаванай не толькі падчас разгулу стыхіі, а яшчэ і ў простых жыццёвых сітуацыях, калі неабходна, напрыклад, парадак у двары навесці. Удзельнікі Беларускай моладзевай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных паспрабавалі пацвердзіць вышэйсказанае, адзначыўшы адзінаццаты дзень народзінаў свайго аб'яднання шэрагам дабрачынных спраў.**



Супрацоўнікі МНС і юныя выратавальнікі разам наведалі 30 дзіцячых прытулкаў і дамоў-інтэрнатаў. Для дзяцей падрыхтавалі розныя гульні і тэатралізаваныя паказы, каб цікава і пераканаўча расказаць аб правілах паводзін у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі. Таксама дзеці паўдзельнічалі ў спартландыі, арганізаванай спецыяльна для свята.

Юныя выратавальнікі не пакінулі без увагі пажылых людзей і шматдзетныя сем'і. Некаторыя паўсядзённыя клопаты ў двары і ў доме ўдзельнікі дабрачыннай акцыі «Моладзь за бяспеку» ўзялі на сябе. Дзесьці паправілі стары плот, дзесьці печ дапамаглі пабяліць. Заадно нагадалі тым, каму дапамагалі, пра асноўныя правілы бяспекі.

На завяршэнне свята — канцэрт (дзе, акрамя артыстаў, выступалі і самі юныя выратавальнікі), а таксама салодкі сюрпрыз для ўсіх прысутных. Замест «імяніннага» торта гасцей пачаставалі марозівам.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## «ДЗЕЛАВЫ ІНТЭРНЭТ» РЫХТУЕ ЎЗНАГАРОДЫ

**24-25 кастрычніка ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў збяруцца тыя, для каго інтэрнэт — інструмент для бізнэсу і рэалізацыі новых ідэй.**

У гэтыя дні там будзе праходзіць сёмая штогадовая канферэнцыя «Дзелавы інтэрнэт». Яе арганізатар — беларускі партал TUT.BY. Дарэчы, у гэтым годзе байнэт стаў «паўналетнім«: яму спаўняецца 18 гадоў.

На сёлетняй канферэнцыі ўпершыню будуць уручаны прэміі байнэту. Па словах дырэктара ТАА «ТУТ БАЙ МЕДИА», ідэйнага натхняльніка канферэнцыі Аляксандра Чэкана, пераможцаў будзе пяць. Прэміямі будуць адзначаны тры важныя падзеі для байнэту, якія вызначаць IT-журналісты, самая яркая рэкламная кампанія, паводле меркавання маркетынг-супольнасці Беларусі, і лепшы стартап года па выніках галасавання стартап-супольнасці рэспублікі.

На канферэнцыі байнэтчыкаў традыцыйна чакаюцца сустрэчы са спецыялістамі з Google, Youtube, Яндекс і іншых вядомых кампаній. У рамках двухдзённай праграмы запланаваны не толькі даклады, але і серыя майстар-класаў. Практычнымі парадамі па выкарыстанні Google Analytics падзеліцца старшы аналітык Google Расія Станіслаў Відзяеў.

Арганізатары ўпэўнены, што ў ПК прафсаюзаў збяруцца людзі, якія зрабілі інтэрнэт у Беларусі па-сапраўднаму дзелавым, а тэхналогіі — сучаснымі.

**Ірына ТАМКОВІЧ.**

**Віншую з днём нараджэння** нявестку — **Наталлю Міхайлаўну ЛУГОЎСКУЮ**, якая працуе настаўніцай у в. Рудня Чэрвенскага раёна.

*Живи, родная, до 100 лет*
*И знай, что лучше тебя нет,*
*И чтоб здоровенька была*
*Сегодня, завтра и всегда.*
*Желаю жить без старости,*
*Работать без усталости,*
*Здоровья — без лечения,*
*Счастья — без ограничения.*
*Желаю благ тебе земных,*
*Я знаю — ты достойна их.*



**Тамара Мікалаеўна.**

# «Я і сёння згадзіўся б на ролю Васіля...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Генадзь Міхайлавіч, найперш дазвольце павіншаваць вас з творчым юбілеем — 50-годдзем працы ў славутым Купалаўскім тэатры.**

— Дзякуй. Сёлетні год запомніцца мне яшчэ адной знакавай датай: 55 гадоў таму я ўпершыню выйшаў на прафесійную сцэну — сцэну драмтэатра імя Я. Коласа ў Віцебску. А ўвогуле пачынаў са школьнай мастацкай самадзейнасці — выконваў сякія-такія драматычныя ролі, чытаў байкі, танцаваў «Крыжачок» і «Лявоніху», так што пытанне «Кім быць?» перада мною не стаяла. У тэатральна-мастацкім інстытуце іграў «сур'ёзных» і трагедыйных герояў, скажам, Ваську Пепла з горкаўскай п'есы «На дне». Гэта быў мой дыпломны спектакль. Самая ж першая роля як прафесійнага акцёра — у вадэвілі «Квадратура круга» паводле В. Катаева — далася амаль што са слязьмі. Добра, што рэжысёр Вячаслаў Броўкін, які таксама пачынаў у Віцебску, дапамог пераадолець страх і неспрактыкаванасць. Ён знаёмы вам як адзін з пастаноўшчыкаў тэлесерыяла «Следства вядуць знатакі». Ну а ў кіно *(смяецца)* дэбютаваў лёгка і проста — рэкламаваў дзяржаўнае страхаванне...

**— Якім быў ваш дэбют у тэатры імя Я. Купалы? І ці не вам належыць першынство ў стварэнні вобраза мележаўскага Васіля?**

— Упершыню на сцэну Купалаўскага тэатра выйшаў для масоўкі ў спектаклі «Паўлінка». Калі сыходзіў з яе па лесвічцы за кулісы — наскрозь, праз бот, прабіў нагу цвіком, чым і помніцца дэбют... Што да Васіля, дык спачатку ён «загаварыў» у радыёспектаклі голасам Віктара Тарасава — вялікага, светлай памяці, артыста. У тэлеверсіі ж рамана Васілём быў сапраўды я. Гэта была мая першая значная роля. Сёлета на свяце беларускага пісьменства ў Глыбокім людзі ў чарзе па шашлыкі так і сказалі пра мяне: «Дык гэта ж Васіль Дзятлік!» Мне было прыемна.

**— За гэтую ролю не толькі ў тэлепастаноўцы, але і ў спектаклі ў 1966 годзе вы атрымалі Дзяржаўную прэмію БССР. Саюзную прэмію, у 1984-м, — зноў жа за ўдзел у «Людзях на балоце», не гэты раз у шматсерыйным фільме...**

— У фільме Віктара Турава выканаў ролю Чарнушкі, Ганнінага бацькі. Таксама багаты, няпросты вобраз, як няпростая душа беларуса-палешука. Я з захапленнем працаваў над ім. Але шкадаваў, што ўжо намнога пераўзышоў узрост Васіля Дзятліка, зайздросціў маладым акцёрам. Ды што зробіш... Дарэчы, гэтай вясной у нашым тэатры Аляксандрам Гарцуевым зроблена новая пастаноўка «Людзей на балоце». Інсцэніроўкай, дэкарацыямі, трактоўкай вобразаў гэта зусім іншы спектакль, а я ў палоне былога, свайго, таму ацэньваць не маю права. Так і сказаў на яго абмеркаванні як сябар мастацкай рады тэатра. *(На хвілінку задумваецца, працягвае весела).* Ды я і сёння мог бы сыграць Васіля! Тэкст дасюль памятаю, загрыміраваўся б так след... Заззначу, аднак, сур'ёзна. Новы спектакль ідзе паспяхова, з аншлагамі. Калі глядзець з пазіцыі сённяшняга часу на нядаўнюю нашу гісторыю, дык рэжысёр меў права на іншае прачытанне і сцэнічнае пераўвасабленне мележаўскага рамана. Спаўна. Міканор у яго, напрыклад, чалавек рэзкі, валявы, не церпіць пярэчанняў — адным словам, такі, якімі былі ці не ўсе бальшавікі.

**— Тэатральныя крытыкі, у тым ліку аўтары энцыклапедычных выданняў, найбольш яркімі ролямі Генадзя Гарбука называюць якраз Васіля з «Людзей на балоце» ды яшчэ Сымона з «Раскіданага гнязда». Самі вы лічыце гэтак жа?**

— Мне не падабаюцца катэгарычныя высновы пра мастацтва. Больш даспадобы звычайнае пытанне гледача: «Вашы любімыя ролі?» Тыя, адказваю, што ўдаліся. Іх, дзякаваць Богу, нямала. Узяць хоць бы працу над вобразам аднаго з братоў, старэйшага, у фільме «Белыя Росы» паводле А. Дударава. Гонар ёсць і ў мяне, што фільм набыў статус народнай камедыі, якая не старэе. Яго глядзяць па некалькі разоў, у чым я ўпэўніўся на публічных сустрэчах і ў прыватных размовах.

**— Нельга абмінуць вашай акцёрскай працы ў мастацкім фільме «Знак бяды», як немагчыма ўявіць іншага Петрака, гаспадара шматпакутнага беларускага хутара, чым ваш.**

— Гэтая роля мне дасталася не адразу. Рэжысёр фільма Міхаіл Пташук «перабраў» многа вядомых акцёраў з Мінска і Масквы, пакуль выбраў «патрэбнага». Дый са мною рабіў кінапробы якое пяць разоў, за што я ніколькі не крыўдую. Як жа! Экранізаваўся знакавы твор і для аўтара, Васіля Быкава, і для сучаснай айчыннай прозы наогул. У ім глыбіня народнага жыцця і народнай трагедыі ў перыяд раскулачвання і вайны. І гэта, на маю думку, удалося ўвасобіць у фільме. Усё было набліжана да рэальнасці. Мяне не пакідалі балючыя перажыванні на працягу здымкаў і за героя, і за ўсё блізкае для іх, жывое. Напраўду, натуральна — такое было рашэнне рэжысёра — забілі ў вядомых вам эпізодах кароўку, каня... Але ж і радасць давала праца над стужкаю: такі ўдзячны, глыбінны матэрыял! Поспех не прымусіў сябе чакаць. У 1987-м, праз год пасля заканчэння здымкаў, на камерцыйным, заўважце, кінафестывалі ў Сопаце рэжысёр-пастаноўшчык і мы з Нінай Руслававай, выканаўцы галоўных роляў, былі ўзнагароджаны залатымі медалямі. «Знак бяды» ўвайшоў у Еўропе ў першую дзясятку фільмаў пра вайну. Менавіта ён, калі вяртацца да папярэдняга пытання, стаў самым адметным у маёй творчай біяграфіі, як бы высока я ні цаніў «Людзей на балоце».

**— Некалькі слоў, Генадзь Міхайлавіч, пра «свайго» Талаша з аднайменнай кінастужкі. Як наогул ішла праца над ёю?**

— Рэальная асоба Васіля Талаша, авеяная легендамі, прываблівала мяне даўно, дык я без ваганняў прыняў прапанову рэжысёра і сцэнарыста Сяргея Шульгі. Ён, трэба адразу сказаць, мала прытрымліваўся аповесці Я. Коласа «Дрыгва», вядомай са школьнай парты, бо не хапала дыялогаў, якія б больш поўна характарызавалі герояў і насычалі фільм, а прыгоды дзеда Талаша, нярэдка з камічнымі сітуацыямі, лёгка маглі б прывесці да аналогіі з шолахаўскім дзедам Шчукаром. Таму ў фільме многа мастацкага вымыслу. Застаўся стрыжань: невераґодная жыццяздольнасць героя, яго ўпартае адстойванне чалавечай годнасці, непакорлівасць чужой уладзе. Я імкнуўся якраз да вобраза «жывога» чалавека, якога паважала ўсё заходнебеларускае Палессе. Наколькі справіўся, няхай мяркуе глядач. Дадам толькі, што праца над чатырохсерыйнай стужкай ішла напружана, здымкі вяліся паўгода, без перапынкаў. Цяперашнія тэлесерыялы здымаюцца значна хутчэй.

**— Ці маеце зараз новыя прапановы ад кінарэжысёраў?**

— Пакуль што ў мяне перапынак...

**Гутарыў Алесь КАСКО.**



У ролі Дзеда Талаша.

■ Кватэрнае пытанне

# ЗРОБЛЕНАЕ ЗНЕСЦІ? ЦІ ПАКІНУЦЬ?

***У нашым доме, пабудаваным пяць гадоў таму, перапланіроўку правяла ці не палова жыльцоў. Прычым больщасць нічога ні з кім не ўзгадняла. Што рабіць? Як з гэтым змагацца?***

**Г. КНЯЗЕЎ,** *г. Мінск.*

Жыллёвым заканадаўствам дапускаецца правядзенне перапланіровак жылых памяшканняў. У Палажэнні аб парадку іх (зацверджана Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2006 г. № 1805) прыведзены канкрэтныя пералікі выпадкаў, калі забараняецца правядзенне работ, а таксама віды рамонтна-будаўнічых работ, для якіх патрабуецца (або не патрабуецца) дазвол мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, а таксама абавязковая распрацоўка праектнай дакументацыі. Выкладзены і парадак атрымання дазволу на пераўладкаванне і перапланіроўку памяшканняў, парадак правядзення і прыёмкі выкананых работ.

У апошнія гады на практыцы разам з павышэннем добраўпарадкавання жылля, паляпшэннем умоў пражывання (гэта асноўная нарматыўная мэта пераўладкавання і перапланіровак), усё часцей ажыццяўляецца правядзенне работ па індывідуалізацыі жылых памяшканняў. Абумоўлена гэта не толькі паляпшэннем матэрыяльнага становішча асобных слаёў насельніцтва, але і імкненнем грамадзян прызвычаіць атрыманае раней або пабудаванае (набытае) жыллё да патрэб канкрэтнай сям'і, з улікам структуры хатняй гаспадаркі, ладу жыцця, асабістых інтарэсаў і патрэб.

Асобная тэма — выкарыстанне жылых памяшканняў у шматкватэрных дамах (з выкананнем адпаведных перапланіровак і пераўладкавання) для ажыццяўлення прафесійнай або індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасці (артысты, навуковыя супрацоўнікі, педагогі-рэпетытары, надомныя работнікі і да т.п.).

Зразумела, што падобнае выкарыстанне жылога памяшкання не павінна парушаць правы і законныя інтарэсы іншых грамадзян, а таксама павінна ажыццяўляцца з улікам патрабаванняў пажарнай бяспекі, санітарна-гігіенічных, экалагічных і іншых патрабаванняў заканадаўства (напрыклад, патрабаванняў па карыстанні камунальнымі сеткамі і абсталяваннем і па ўтрыманні жылога дома ў адпаведнасці з тэхнічнымі параметрамі будынка, узроўню шуму і іншых падобных стандартаў).

Парушэнне Правіл карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў жылога дома, самаўпраўства ў рэалізацыі сваіх інтарэсаў і ўшчамленне законных правоў і інтарэсаў іншых грамадзян і іх арганізацый цягне адміністрацыйную, крымінальную або іншую адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Што датычыцца забароненых самавольных пераўладкаванняў і перапланіровак памяшканняў, то асобы, якія ажыццявілі іх, таксама нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам. Яны абавязаны за свой кошт правесці аднаўленчыя работы па прывядзенні памяшкання ў ранейшы стан. Гэтыя работы ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з вызначаным парадкам вытворчасці і прыёмкі ў эксплуатацыю работ па пераўладкаванні і перапланіроўцы памяшканняў.

Па дазволе мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, атрыманым у вызначаным парадку, памяшканне, самавольна пераўладкаванае і перапланаванае з выкананнем тэхнічных нарматыўных прававых актаў, можа быць захавана ў пераўладкаваным і перапланаваным стане.

Спрэчкі паміж грамадзянамі, звязаныя з пытаннямі эксплуатацыі і ўтрымання памяшканняў, разглядаюцца ў судовым парадку. Падставай для звароту ў суд могуць служыць адпаведныя заключэнні жыллёва-эксплуатацыйнай арганізацыі і санэпідэмстанцыі.

**Віктар САВІЦКІ**

■ Факт

## З дзяржаўнага фонду мінчанам здадзены ў арэнду 144 жылыя памяшканні

**Мінчанам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, здадзены ў арэнду 144 жылыя памяшканні з дзяржаўнага фонду.**

Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Аляксандр Аўраменка. У бліжэйшы час будуць засялены яшчэ 58 арандаваных кватэр. Інфармацыя пра некаторыя з іх вывешана на стэндах і сайтах раённых адміністрацый сталіцы. У іншых пакуль ідзе касметычны рамонт, пасля чаго звесткі пра іх таксама стануць даступнымі гараджанам. Попыт на арэнднае жыллё з дзяржфонду стабільна высокі: вар'іруецца ад 5 да 30 заявак на адну кватэру. Больш за ўсё ахвотных здымаць аднапакаёвыя кватэры.

Нагадаем, што на працягу 2013—2015 гадоў у горадзе плануецца пабудаваць 3000 арэндных кватэр. З іх у 2013-м — 500, у 2014-м — 1500, а ў 2015-м — яшчэ 1000. Сёлета пачата будаўніцтва двух арэндных дамоў.

## Мінчанін Юрый Паддубны прайшоў 27 км, набіваючы мяч

**Юрый Паддубны прайшоў усю мінскую веладарожку, набіваючы футбольны мяч. Дыстанцыя складае 27 км.**

Стартаваў мінчанін у Лошыцкім парку, а фінішаваў у жылым раёне Дразды. На пераадоленне трасы ў Юрыя Мікалаевіча пайшло 8 гадзін 2 хвіліны і 15 секундаў. За 27 кіламетраў мяч упаў на зямлю 15 разоў. Усяго мінчанін стукнуў па мячы каля 37 400 разоў. Сваё дасягненне Юрый Паддубны прысвяціў любімаму футбольнаму клубу — барысаўскаму БАТЭ.

Адзначым, што Юрый Паддубны працуе ў ААТ «Інтэграл» 27 гадоў у цэху № 27. У яго бліжэйшых планах асіліць марафонскую дыстанцыю — 42 км 190 м.

*«Мінск-Навіны»*

■ Здарэнне

## ШКОЛЬНІЦ СА СЛУЦКАГА РАЁНА ЗАТРЫМАЛІ ПАД МІНСКАМ З НАРКОТЫКАМІ

**Вучаніцы адной з сярэдніх школ Слуцкага раёна летам гэтага года спрабавалі пранесці на дыскатэку "Глобал Гезерынг", што непадалёк ад вёскі Баравая, марыхуану. Але былі затрыманы пры ўваходзе супрацоўнікамі аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Мінскага РУУС.**

Са слоў дзяўчат, наркотыкі яны набылі, каб больш весела правесці час на дыскатэцы. Пры гэтым абедзве непаўналетнія станоўча характарызаваліся па месцы вучобы.

Як распавёў «Звяздзе» **пракурор аддзела пракуратуры Мінскай вобласці Павел МАЙСАК,** па выніках дадатковай праверкі ў дачыненні да дзяўчат заведзены крымінальныя справы па ч. 1 артыкула 328 КК (незаконныя без мэты збыту набыццё, захоўванне, перавозка наркатычных сродкаў). Максімальнае пакаранне, прадугледжанае гэтым артыкулам, — пазбаўленне волі на тэрмін да пяці гадоў.

Не выключаецца, што пасля заканчэння расследавання ў дачыненні да школьніц будзе прыменены акт амністыі. Але Павел Майсак звярнуў увагу на тое, што спыненне крымінальнай справы ў сувязі з прымяненнем акта амністыі не з'яўляецца рэабілітуючай падставай вызвалення ад крымінальнай адказнасці. У такім выпадку згодна з законам «Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх» падлеткі будуць пастаўлены на прафілактычны ўлік у органах унутраных спраў, установах адукацыі, што пасля будзе адлюстравана ў характарыстыках, неабходных для далейшай вучобы і працы.

**Надзея ДРЫЛА**

# Извещение о проведении 31 октября 2012 г. 129-го открытого аукциона

## по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска

| № | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Общ. пл. (кв.м) | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| | **УП «ЖРЭО Заводского района», тел. 285 56 02** | | |
| 1. | Ул. Ангарская, 36. Помещение № 22а находится на 1 этаже отдельно стоящего здания. Имеется отопление, естественное освещение, энергоснабжение. Вход и санузел общий с другими арендаторами. Требуется косметический ремонт. Под бытовые услуги (парикмахерскую). | 16,1 | 1 610 |
| 2. | Ул. Ангарская, 36. Помещение № 22 находится на 1 этаже отдельно стоящего здания. Отсутствуют отопление и естественное освещение. Под бытовые услуги. | 15,3 | 1 530 |
| 3. | Пр. Партизанский, 147. Две комнаты на 1 этаже. Имеется естественное освещение, отопление, вход и санузел общие с другими арендаторами. Требуется косметический ремонт. Под административные цели (офис). | 22,9 | 2 290 |
| | **УП «ЖРЭО Октябрьского района», тел. 213 29 60** | | |
| 4. | Ул. Чкалова, 1. Помещение на 1 этаже жилого дома. Имеется отопление, санузел совместно с другими арендаторами, вход со двора, требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 60,9 | 6 090 |
| | **УП «ЖРЭО Партизанского района», тел. 294 01 11** | | |
| 5. | Ул. Грицевца, 3. Отдельный вход. Отсутствует освещение. Под магазин непродовольственной группы товаров. | 8,4 | 840 |
| | **УП «ЖРЭО Первомайского района», тел. 285 72 92** | | |
| 6. | Ул. Козлова, 33. Помещение на первом этаже жилого дома. Санузел и вход совместно с опорным пунктом РУВД. Под административные цели (офис). | 38,4 | 3 840 |
| 7. | Ул. Калинина, 25. Помещение – 34,5 кв.м под продовольственные товары; 15,6 кв.м – под непродовольственные товары и 31,0 кв.м – под подсобные помещения в подвале жилого дома. В помещении необходимо проведение ремонта. Под магазин продовольственной и непродовольственной группы товаров. | 81,1 | 8 110 |
| 8. | Ул. Калиновского, 53, корп. 2. Комната № 21 в цокольном этаже жилого дома. Имеется естественное освещение. Требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 19,9 | 1 990 |
| 9. | Ул. Калиновского, 53, корп. 2. Блок из трех комнат. Имеется естественное освещение. Под административные цели (офис). | 56,0 | 5 600 |
| 10. | Ул. Калиновского, 87. Помещение на 1 этаже жилого дома. В помещении необходимо проведение ремонта. Под магазин продовольственной и непродовольственной группы товаров. | 289,4 | 28 940 |
| 11. | Ул. Острошицкая, 7. Помещение из 2-х комнат (кабинет – 16,3 кв.м и склад – 16,8 кв.м без естественного освещения) на 2 этаже отдельно стоящего здания КУП «ЖЭУ-107». Требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 33,1 | 3 310 |
| 12. | Ул. Героев 120 дивизии, 15. Комната № 43а на 2 этаже отдельно стоящего здания ГДО. Отсутствует естественное освещение. Под административные цели (офис). | 5,7 | 570 |
| 13. | Ул. Героев 120 дивизии, 15. Комната № 128б на 3 этаже. Отопление имеется. Вход, холодная вода и санузел используется совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 11,6 | 1 160 |
| 14. | Ул. Героев 120 дивизии, 15. Комната № 43Б на 2 этаже. Отопление имеется. Вход, холодная вода и санузел используется совместно с другими арендаторами. Отсутствует естественное освещение. Под склад. | 11,1 | 1 110 |
| 15. | Пер. Инструментальный, 3. Комната № 2 на 2 этаже. Отопление, естественное освещение – имеется. Холодная вода и санузел используется совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 14,8 | 1 480 |
| 16. | Пер. Инструментальный, 5. Комната № 6 на 1 этаже. Отопление, естественное освещение – имеется. Холодная вода и санузел используется совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 16,4 | 1 640 |
| 17. | Пер. Инструментальный, 5. Комната № 204 на 2 этаже. Отопление, естественное освещение – имеется. Холодная вода и санузел используется совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 12,5 | 1 250 |
| | **УП «ЖРЭО Советского района», тел. 292 74 31** | | |
| 18. | Ул. Мирошниченко, 12, корп.1. Помещение на 1 этаже жилого дома. Имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, санузел, лоджия со стороны главного фасада. Вход совместно с жильцами дома. Требуется ремонт, перепрофилирование помещения, устройство отдельного входа за счет средств арендатора. Под административные цели (офис), оказание услуг. | 25,3 | 2 530 |
| | **КУП «Минская спадчина», тел. 226 53 04; 226 47 34** | | |
| 19. | Пл. Свободы, 4. Блок из 7-ми кабинетов, подсобные помещения, санузлы на 2 этаже здания. Имеется отопление, естественное освещение, вход общий с другими арендаторами. Под размещение представительства иностранного предприятия. | 232,9 | 23 290 |
| 20. | Ул. Комсомольская, 7. Комната на мансардном этаже здания. Имеется отопление, естественное освещение, санузел и вход общий с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 15,9 | 1 590 |
| 21. | Ул. Революционная, 6в. Блок из 6-ти комнат, холла, санузла на 1 этаже здания. Имеется отопление, естественное освещение, вход общий с другими арендаторами. Под размещение представительства иностранного предприятия. | 162,7 | 16 270 |
| | **КУП «Минский городской центр недвижимости», тел. 328 51 00** | | |
| 22. | Пр. Победителей, 5. Комната № 413 на 4 этаже. Имеется отопление, естественное освещение, электроснабжение. Санузел совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис), (кроме общественных организаций). | 19,1 | 1 910 |
| | **Комитет по образованию Мингорисполкома, тел. 306 43 72, 306 43 88** | | |
| 23. | Ул. Тимирязева, 9а. Набор помещений на 1 этаже административного здания, соответствующие требованиям для организации питания. Имеется энергоснабжение, естественное освещение, отопление, водоснабжение, канализация и необходимое торгово-технологическое оборудование. Вход общий. Под объект общественного питания (столовая – для работников учреждения и посетителей). | 772,2 | 77 220 |
| | **УП «БЫТЭКС», тел. 306 28 41** | | |
| 24. | Ул. Кульман, 5, пом. № 30. Помещение без естественного освещения на третьем этаже. Под производственное использование (склад). | 15,0 | 1 500 |
| 25. | Ул. Л.Чайкиной, 4. Помещения № 24 с естественным освещением на 2 этаже здания КБО. Имеется электроснабжение, отопление, водопровод и канализация. Под административные цели (офис). | 31,22 | 3 120 |
| | **УЗ «5-я городская клиническая больница», тел. 295 31 01** | | |
| 26. | Ул. Филатова, 9. Площадь в холле 1 этажа административного здания клинической больницы. Имеются электроэнергия, естественное освещение, отопление, водоснабжение, канализация. Для размещения объекта по оказанию фотоуслуг. | 1,8 | 180 |
| | **УЗ «37-я городская поликлиника», тел. 298 81 91** | | |
| 27. | Ул. Я.Лучины, 28. Цокольный этаж административного здания поликлиники. Имеется отопление, естественное освещение, водоснабжение, канализация, новое оборудование. Нет телефона. Под буфет. | 128,76 | 12 870 |
| | **ГУПР Мингорисполкома, тел. 219 00 78** | | |
| 28. | Пл. Независимости, 5, подземный переход № 8. Помещение № 5 в подземном переходе. Имеется отопление, энергоснабжение. Под торговый объект непродовольственной группы товаров. | 36,9 | 3 690 |
| 29. | Ул. Ванеева, 24а. Отдельно стоящее здание. Имеется водоснабжение, канализация, энергоснабжение. Под прием стеклотары от населения. | 199,0 | 19 900 |
| 30. | Пр. Партизанский, подземный переход перед универмагом «Беларусь». Помещение № 9 в ТЦ «Партизанский». Имеется отопление, энергоснабжение. Под торговый объект непродовольственной группы товаров. | 11,7 | 1 170 |
| | **ПКУП «Производственная база по улице Казинца», велком 6416187, тел. 212 24 94** | | |
| 31. | Ул. Казинца, 42. Помещение в здании рыбного цеха. Имеется естественное освещение и отопление. Под размещение специалистов или иное использование по согласованию с арендодателем. | 50,8 | 5 080 |
| 32. | Ул. Казинца, 42. Помещение в здании рыбного цеха. Отсутствует естественное освещение и отопление. Требуется ремонт. Под склад продовольственных товаров. | 44,8 | 4 480 |
| 33. | Ул. Казинца, 42. Помещение в здании рыбного цеха. Отсутствует естественное освещение и отопление. Требуется ремонт. Под склад продовольственных товаров. | 32,4 | 3 240 |
| 34. | Ул. Казинца, 42. Кабинет № 5 в здании охлаждаемых складов с рампой. Имеется естественное освещение, отопление. Под размещение специалистов или иное по согласованию с арендодателем. | 23,0 | 2 300 |
| 35. | Ул. Казинца, 42. Кабинет № 7 в здании охлаждаемых складов с рампой. Имеется естественное освещение, отопление. Под размещение специалистов или иное по согласованию с арендодателем. | 13,7 | 1 370 |
| 36. | Ул. Казинца, 42. Кабинет № 11 в здании охлаждаемых складов с рампой. Имеется естественное освещение, отопление. Под размещение специалистов или иное по согласованию с арендодателем. | 12,5 | 1 250 |
| 37. | Ул. Казинца, 42. Помещение в здании охлаждаемых складов с рампой. Имеется естественное освещение, отопление. Под размещение специалистов или иное по согласованию с арендодателем. | 29,3 | 2 930 |
| | **УП «Партизанское», тел. 200 11 84** | | |
| 38. | Ул. Стебенева, 2. Помещение в здании спец. складов, торговых баз, хранилищ (засолочный цех). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 258,2 | 25 820 |
| 39. | Ул. Центральная, 46. Шесть помещений различной площади на 1 и 2 этажах в отдельно стоящем здании весовой. Имеется электроотопление, водоснабжение, электроснабжение и санузел. Отдельный вход. Под административные, подсобные помещения, под склад, склад оптовой торговли. | 167,64 | 16 760 |
| 40. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад № 3). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 548,0 | 54 800 |
| 41. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад № 3). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 560,0 | 56 000 |
| 42. | Ул. Центральная, 46. Часть помещения в здании спец. складов (склад № 3). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 200,0 | 20 000 |
| 43. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (картофелехранилище). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли, производственные цели. | 365,0 | 36 500 |
| 44. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (лукохранилище). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 1663,2 | 33 264 |
| 45. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад № 1). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 25,4 | 2 540 |
| 46. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад № 1). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 22,0 | 2 200 |
| 47. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад №1). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 24,9 | 2 490 |
| 48. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад №1). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 12,4 | 1 240 |
| 49. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад №1). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 11,9 | 1 190 |
| 50. | Ул. Центральная, 46. Помещение в здании спец. складов (склад №1). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 286,1 | 28 610 |
| 51. | д. Таборы, Минский район. Помещение в здании спец. складов (фруктохранилище). Имеется водоснабжение, канализация и отопление. Требуется косметический ремонт. Под административные цели (офис). | 15,4 | 1 540 |
| 52. | д. Таборы, Минский район. Помещение на 2 этаже в здании спец. складов (фруктохранилище). Имеется водоснабжение, канализация и отопление. Требуется косметический ремонт. Под административные цели (офис). | 10,9 | 1 090 |
| 53. | Ул. Мавра, 1а. Помещения в здании продовольственного магазина «Солнечный». Имеется отдельный вход. Под магазин розничной торговли непродовольственными товарами, за исключением синтетических моющих средств, парфюмерно-косметических товаров, оказание услуг. | 48,8 | 4 880 |
| | **ТЦ «Купаловский», ст. метро «Октябрьская», тел. 321 20 00** | | |
| 54. | ТЦ «Купаловский». Торговое место № 41. Под торговлю непродовольственными товарами. | 5,6 | 560 |
| 55. | ТЦ «Купаловский». Торговое место № 111. Под торговлю непродовольственными товарами. | 3,3 | 330 |
| | **ТКУП «Минский Комаровский рынок», тел. 331 42 62** | | |
| 56. | Ул. В.Хоружей, 8. Территория сезонного рынка, киоск № 1. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 5,29 | 520 |
| | **Управление бытового и гостиничного обслуживания населения Мингорисполкома, тел. 200 99 90** | | |
| 57. | Пер. Козлова, 3а. Помещение на 3 этаже здания КБО. Имеется отопление, естественное освещение, электроснабжение. Под административные цели (офис), производство, бытовые услуги. | 32,02 | 3 200 |
| | **КУП «Бизнес-центр «Столица», тел. 239 78 30** | | |
| 58. | Пр. Победителей, 59. Помещение № 312 на 3 этаже бизнес-центра класса А. Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение, кондиционер, телефон, санузел совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 42,2 | 4 220 |
| 59. | Пр. Победителей, 59. Помещение № 314 на 3 этаже бизнес-центра класса А. Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение, кондиционер, телефон, санузел совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 44,4 | 4 440 |
| 60. | Пр. Победителей, 59. Встроенное помещение № 318 на 3 этаже бизнес-центра класса А. Без естественного освещения. Имеются отопление, электроснабжение, санузел совместно с другими арендаторами. Под склад. | 8,4 | 840 |
| | **ПТКУП «Чайка», тел. 281 24 19** | | |
| 61. | Ул. Кнорина, 55. Комната № 61 на 2 этаже здания. Отсутствует естественное освещение. Имеется электроснабжение, отопление. Под административные цели (офис), склад. | 15,5 | 1 550 |
| | **УП «Городские бани», тел. 222 08 92** | | |
| 62. | Ул. Марьевская, 5. Два парикмахерских зала, комната персонала, подсобное помещение, кладовая в здании БК «Лазня». Имеется центральное отопление, естественное освещение, электроснабжение, два входа. Под парикмахерскую. | 66,0 | 6 600 |
| 63. | Ул. В.Хоружей, 44. Помещение на 1 этаже двухэтажного отдельно стоящего здания бани № 8. Имеется центральное отопление, водоснабжение, электроснабжение, естественное освещение, два входа. Под оказание услуг (бильярд). | 27,2 | 2 720 |
| | **УП «Ремавтодор Заводского района г. Минска», тел. 341 32 46** | | |
| 64. | Ул. Машиностроителей, 7. Помещение на 1 этаже административного хозяйственного здания. Имеется отопление, электроснабжение и канализация. Под административные цели (офис). | 23,4 | 2 340 |
| | **УП «Минскметрострой», тел. 285 32 08, СМУ № 1, тел. 203 82 62** | | |
| 65. | Ул. Соломенная, 13. Комната № 19 на 2 этаже в здании АБК. Имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение в санузле на 1 этаже, без телефона. Пропускная система. Здание находится на реконструкции. Проводятся внутренние и наружные строительные работы. Под административные цели (офис). | 18,0 | 1 800 |
| | **КПУП «Минскреклама», тел. 294 03 85, 290 55 06** | | |
| 66. | Ул. Захарова, 76. Помещение на 3 этаже административно-производственного здания. Имеется естественное освещение, отопление. Отсутствует электроснабжение, водоснабжение. Без предоставления юридического адреса. Требуется капитальный ремонт помещения за счет средств арендатора без возмещения затрат. Под административные цели (офис). | 42,5 | 4 250 |
| | **УП «Спецкомбинат КБО», тел. 204 21 50** | | |
| 67. | Ул. Ольшевского, 12. Специфическое сооружение, открытая площадка с твердым покрытием перед зданием КБО. Под торговый автомат по приготовлению горячих и холодных напитков. | 1,5 | 150 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Аукцион состоится **31 октября 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

